УДК 34(091)

# АСАБІСТЫЯ І МАЁМАСНЫЯ ПРАВЫ СЯЛЯН ПА РЭФОРМЕ 1861 ГОДА

**Кожар А. В.,** ст. выкладчык каф «Эканоміка і права»
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

У першым артыкуле «Агульнага палажэння аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці» гаварылася: «Крепостное право на крестьян, водворенных в помещичьих имениях, и на дворовых людей отменяется навсегда…» [1, с. 39]. Сялянам даваліся правы вольных сельскіх абывацеляў як асабістыя, так і маёмасныя.

Пасля вызвалення сяляне лічыліся «часова абавязанымі», а пасля выкупу ва ўласнасць зямельных участкаў называліся «сялянамі-ўласнікамі» (арт.15, арт.16).

Шэраг палажэнняў абвешчаных законам, давалі сялянам некаторыя свабоды. Так на сялян сталі распаўсюджвацца агульныя палажэнні законаў грамадзянскіх аб правах і абавязках сямейных. З гэтага часу на заключэнне шлюбу паміж сялянамі і распараджэнне ў іх сямейных справах, не патрабавалася згоды памешчыка (арт. 21).

Сялянам дазвалялася ўступаць «ва ўсякія законам дазволеныя дагаворы абавязацельствы і падрады, як з прыватнымі асобамі, так і з казною». Таксама ім дазвалялася свабодна гандляваць, уступаць у гільдыі, адкрываць і ўтрымліваць фабрыкі, запісвацца ў цэхі. Рэальна гэтыя правы выконвацца не маглі, бо селянін абавязаны быў выконваць павіннасці памешчыку на зямельным участку і нікуды не мог адлучацца.

Сяляне атрымалі права па прадстаўленні сваіх правоў у судзе па грамадзянскіх, крымінальных і адміністрацыйных справах. Пакаранню яны маглі падвяргацца толькі па прыгаворы суда (арт. 25). Хаця сяляне маглі вырашаць спрэчкі ў судовым парадку, аднак памешчык мог па сваім жаданні без асабістага ўпаўнаважання селяніна удзельнічаць у яго справах. Такім чынам, закон захоўваў за памешчыкамі ў дачыненні да сваіх былых сялян судовыя паўнамоцтвы, бо на прадстаўленне інтарэсаў селяніна ў судзе патрабавалася не згода, а неабходна было толькі жаданне памешчыка.

Пасля вызвалення сяляне маглі пераходзіць у іншыя саслоўі, пакідаць месца жыхарства, аддаваць дзяцей у агульныя навучальныя ўстановы. Аднак права навучання сялянскіх дзяцей у навучальных установах практычна абмяжоўвалася толькі сельскай школай, бо сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы для сялянскіх дзяцей заставаліся па-ранейшаму недаступнымі [3, с. 58].

Маёмасныя правы сялян пасля адмены прыгоннага права таксама змяніліся.

Да адмены прыгоннага права ўся маёмасць, якая была набыта і знаходзілася ў селяніна і яго сям'і, з'яўлялася ўласнасцю памешчыка. Тым больш уласнасцю памешчыка з'яўляўся зямельны надзел, сядзібны надзел, лугі і пашавыя ўгодзі.

Пасля адмены прыгоннага права ўся зямля заставалася ва ўласнасці памешчыка. Па арт. 3 «Агульнага палажэння…» памеш-чыкі, захоўваючы права ўласнасці на зямлі, прадастаўляюць, за замацаваныя павіннасці, у пастаяннае карыстанне сялян, сядзібную іх аселасць, і звыш таго, для забеспячэння іх быту і для выканання іх абавязкаў перад урадам і памешчыкам, ту колькасць палявой зямлі і іншых угоддзяў, «якія вызначаюцца мясцовымі палажэннямі» [1, с. 39].

Сяляне павінны былі выкупіць «сядзібную аселасць» у памешчыка. Усю рухомую маёмасць сялян (хатняе і працоўнае быдла, земляробчыя прылады і іншае) належала сялянам. Аднак зямлі, дамы і іншая нерухомая маёмасць, набытая сялянамі ў ранейшы час на імя памешчыка «умацоўвалася за сялянамі або іх спадкаемцамі канчаткова, па зацвярджэнні за імі гэтых маёмасцяў самімі памешчыкамі або рашэннямі міравых устаноў» (арт. 32).

У адпаведнасці з гэтым артыкулам канчаткова пытанне аб прадастаўленні маёмасці набытай селянінам у яго ўласнасць вырашалася памешчыкам. Памешчык пры гэтым не быў абавязаны аддаць маёмасць селяніну, гэта было ўсяго толькі яго правам.

«Агульным палажэннем…» давалася права памешчыкам заключаць з сялянамі добраахвотныя пагаднення, вызначаючы памер пазямельнага надзелу і павіннасці, якія за надзел павінен быў несці селянін. Для правядзення ў жыццё рэформы, закон усталёўваў двухгадовы тэрмін, на працягу якога цалкам захоўваўся прыгоннай парадак.

Як адзначае Е. А. Марахавец «сялянскія надзелы і пасля рэформы захавалі сваю няўстойлівасць: памешчык мог у любы момант адабраць у сялян атрыманую імі зямлю і даць узамен іншую, калі гэта было для яго выгадным» [2, с. 108].

Такім чынам рэформа 19 лютага 1861 года насіла палавінчаты характар, бо пасля яе захавалася шмат прыгонніцкіх перажыткаў. На працягу двух гадоў пасля правядзеннем рэформы ўсё павінна было заставацца па старому. Сяляне не былі ўраўнованы з астатнімі саслоўямі ва ўсіх правах. Сяляне не атрымалі ва ўласнасць зямлю, а павінны былі яе выкупаць у памешчыкаў.

Пры гэтым рэформа 19 лютага 1861 года мела велізарнае значэнне. Захоўваючы ў значнай ступені прыгонніцкай перажыткі, яна адзначыла сабой пачатак новага этапу развіцця капіталістычнага грамадства і доўгі час вызначала ход развіцця капіталізму і расстаноўку класавых сіл у краіне. Палажэнне 19 лютага заклікала да самастойнага грамадзянскага жыцця мільёны рускага насельніцтва, да гэтай пары якое існавала на становішчы бяспраўнага рабства.

Дзякуючы рэформе паўстала і адужэла ўяўленне аб чалавечай асобе, як носьбіце неад'емных правоў чалавека, нягледзячы ад займаемага дадзеных асобай грамадскага становішча і прыналежнасці да таго ці іншага саслоўя. У сялянах, якія не ўсьведамлялі за сабой ніякіх правоў, прачнуўся «чалавек».

**Спіс літаратуры**

1. Крестьянская реформа в России 1861 года. Сборник законодательных актов / Сост.: Софроненко К.А. – М.: Госюриздат, 1954. – 499 с.

2. Крестьянская реформа 1861 г.: Науч.-попул. очерк. – М. : Соцэкгиз, 17 ф-ка нац. книги треста «Полиграфкнига», 1937. – 162 с.

3. Софроненко К. А. Аграрное законодательство в России (вторая половина XIX-XX начало вв.). Изд-во Моск. Ун-та. – М. 1981. – 219 с.